# КУРАПАЦЕНКА ФЁДАР КУЗЬМІЧ – 110

Нарадзіўся ў в. Малыя Бялевічы Магілёўскага раёна ў 1903 г. Школу скончыў у 20 гадоў, а праз 3 гады – Магілёўскі педтэхнікум. Як аднаго з найлепшых выпускнікоў яго накіравалі вучыцца на землеўпарадкавальны факультэт БДСГА.

Пасля сканчэння акадэміі, у 1931-1939 гг. працаваў у Наркамземе і Гомельскім абласным земадзеле, праводзіў тапаграфічныя здымкі і землеўпарадкаванне калгасаў і саўгасаў. У 1939 г. запрошаны на працу ў БДСГА. Працягваючы навуковыя даследванні, у 1940 г. Ф. Курапаценка друкуе ў часопісе «Геадэзіст» свой першы артыкул «Аб выкарыстанні планаў земляў калгасаў і саўгасаў для мэт картаграфавання». У гэты час ён сканструяваў геадэзічны прыбор-хордавугламер, які замяняе транспарцір. Перад вайной Наркамзем СССР замовіў партыю ў 5 тыс. адзінак прыбораў. За навуковыя распрацоўкі ў 1941 г. яму прысвоена званне дацэнта.

У гады Вялікай Айчыннай вайны – на фронце. З баямі прайшоў Падмаскоўе, Смаленшчыну, родную Беларусь. Некаторы час быў выкладчыкам і начальнікам артылерыйскай школы, атрымаў званне маёра.

Пасля вайны вярнуўся ў БДСГА: дацэнт, дэкан землеўпарадкавальнага факультэта, загадчык кафедрай землеўпарадкавальнага праектавання, прафесар гэтай кафедры. У 1949 г. абараняе кандыдацкую дысертацыю, у 1961 – яму прысвойваюць званне прафесара. Праводзіў вялікую навуковую і грамадскую працу. Надрукаваў больш за 100 навуковых прац, шматлікія з якіх і сёння маюць навуковае і практычнае значэнне. Шмат гадоў ён працаваў над методыкай складання землеўпарадкавальных карт. У 1957 г. выйшла яго манаграфія «Землеустроительное картографирование зон деятельности МТС и административных районов» – адзінае ў СССР падобнае выданне. Першым у СССР ён распрацаваў шэраг пытанняў па прагназаванню выкарыстання зямельных рэсурсаў. Шмат часу ён надаваў распрацоўцы і ўкараненню ў вытворчасць навуковых асноў меліярацыйнай рэкультывацыі суфазійных западзін на лёсападобных землях Беларусі. Гэта дапамагло вярнуць у сельскагаспадарчы абарот сотні гектараў урадлівых земляў, павялічыць контуры палёў, падвысіць эфектыўнасць іх выкарыстання.

Ф. Курапаценка шмат увагі надаваў падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Ён падрыхтаваў 19 кандыдатаў навук, стварыў агульнапрызнаную школу беларускіх землеўпарадкавальнікаў. Праца навукоўца і ветэрана вайны адзначана 4 ордэнамі, 12 медалямі, 4 Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, 2 медалямі ВДНГ СССР. «Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР» (1973 г.). Памёр у 1993 г.

*У.Г. Хамякоў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова